# Прэзентацыя выдання «За цябе, Беларусь!» адбылася ў галерэі «Лабірынт»

23.05.2024 09:08 | Аўтар: Лізавета Голад | Культура, Літаратура

**Прэзентацыя ўнікальнага выдання «За цябе, Беларусь!» адбылася ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**




Важны падарунак да святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў зрабіла чытачам выдавецтва «Мастацкая літаратура». Менавіта тут нарадзілася ідэя зрабіць цікавую кнігу, якая сумяшчае храналогію асноўных падзей Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі з публіцыстычнымі і літаратурнымі творамі беларускіх пісьменнікаў. І гэта карыстаецца вялікім попытам! Выданне выйшла ў свет тыражом у 2,5 тысячы асобнікаў. На дадзены момант ужо больш за 2 тысячы прададзена.

— Спачатку ўсё бачылася ў нейкіх штрыхах, але ў выдавецтве працуюць вельмі творчыя людзі. Мы з дырэктарам Алесем Бадаком прыкінулі і вырашылі зрабіць храналогію ад першага дня вайны да самага вызвалення. Я выбраў менавіта тыя дні, калі на беларускай зямлі адбываліся важныя падзеі, — падзяліўся **складальнік выдання Віктар Шніп**.










> Таксама ён дадаў, што для таго, каб зрабіць выданне больш цікавым, вырашыў паглядзець, як адгукаліся аб гэтых падзеях пісьменнікі ў сваіх дзённікавых запісах.

— *У Беларусі больш за 250 пісьменнікаў былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны*. Многія з іх вялі дзённікі. Я ўзяў вытрымкі адтуль. І хачу вам сказаць, што па гэтых запісах выразна бачна, што ўсе пісьменнікі з першых дзён верылі у Перамогу, — дадаў Віктар Шніп.

Так, на старонках кнігі прыводзяцца вершы, дзённікавыя запісы і ўспаміны такіх знакамітых асоб, як Янка Купала, Якуб Колас, Пётр Глебка, Максім Танк, Кузьма Чорны, Петрусь Броўка і іншых.







Таксама трэба адзначыць, што гэта выданне з'яўляецца вынікам плённай сумеснай працы з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта дзякуючы яму кніжка багата праілюстравана фотаздымкамі і дакументамі.

Праца над кнігай вялася каля паўгода і была не самай лёгкай.

> — Матэрыялаў шмат, скампанаваць усё было няпроста. **Афармленне, дызайн і вокладку падбіралі сумесна з мастацкім рэдактарам Міхаілам Дайлідавым. Кніжка атрымалася ўнікальная. Такой у нас яшчэ не было**, — адзначыў Віктар Шніп.










Па словах пісьменніка, гэта выданне своеасаблівы падручнік па гісторыі Вялікай Айчынай вайны, па якім можна праводзіць урокі выхавання моладзі.

— Такія кнігі выхоўваюць сапраўдных патрыётаў нашай зямлі, а пісьменнікаў подзвігі нашых продкаў натхнялі, натхняюць і будуць натхняць на новыя творы, — заключыў Віктар Шніп.




**Лізавета ГОЛАД**

**Фота аўтара**

Навіны | Папулярнае

09:48 Стралкі з вінтоўкі Пранько і Чарноў перамаглі на Кубку Расіі ў турніры змешаных пар

09:35 Абаронныя ведамствы Беларусі і Егіпта зацікаўлены ва ўзаемным супрацоўніцтве

09:12 Беларусь ратыфікавала пратакол з Расіяй, які падаўжае гарантыйны тэрмін эксплуатацыі абсталявання БелАЭС

08:50 Хто мае права адмовіцца

УСЕ НАВІНЫ

**Іншыя матэрыялы аўтара**

- Яна падкажа, што вам апрануць
- Цікавосткі ад маладых наватараў
- Як прайшоў маладзёжны форум «Сэнс. Жыццё. Будучыня»
- II Рэспубліканскі тэатральны фестываль «Перамога» праходзіць у Мінску
- Кола(с) часу, альбо ноч музеяў у літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа